Лубок і прыпеўка ствараюцца для масавага карыстання і страчваюць свой сапраўдны сэнс па-за такім карыстаннем. Яны маюць вялікі творчы патэнцыял і магчымасці актывізацыі гэтага сэнсу, дзякуючы годнасці мастацкай формы і зместу, якія адпавядаюць сутнасным характарыстыкам традыцыйнага мастацтва.

Л.Е.Раманенка,
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# УНІВЕРСАЛЬНАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ Ў СІСТЭМЕ САМАСТОЙНАЙ ВУЧЭБНА-ТВОРЧАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Маральныя якасці чалавека праяўляюцца ў стаўленні яго да прыроды, грамадства, іншага чалавека, самога сябе. Вопыт жыццядзейнасці даказаў, што толькі гарманічнае існаванне чалавека ў прыродзе і сацыяльнай сферы зможа захаваць яго як від і падняць на больш высокі ўзровень развіцця як асобу.

Нарматыўна-рацыянальны падыход ў арганізацыі адукацыі яшчэ нядаўна дамінаваў у рэспубліцы. У цяперашні час у рэспубліканскую сістэму адукацыі закладваецца сацыяльна-культурны прынцып функцыянавання. Павольна, але грунтоўна ўзрастае цікавасць да нацыянальнай кампаненты, асэнсоўваецца станоўчая і жыццесцвярджальная роля нацыянальнай культуры ў кантэксце сусветнай, вызначаецца яе змест. Змяняецца сама парадыгма адукацыі, а гэта, у сваю чаргу, патрабуе змен у сістэме арганізацыі перадачы культурнага вопыту пакаленняў і падрыхтоўкі педагагічных кадраў.

Безумоўна, змена толькі зместу адукацыі, як паказала шматгадовая практыка, не зможа цалкам задаволіць патрэбы сённяшняга дня. Менавіта фарміраванне прынцыпова новага тыпу педагога-інтэлігента (не па яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

статусных знешніх адзнаках, а па сутнасці) дазволіць разарваць кола пануючай бездухоўнасці падрастаючага пакалення, якая, на жаль, становіцца прыметай часу. Падрыхтоўка педагога — спецыяліста ў галіне народнай культуры — гэта і выйсце, і неабходная заканамернасць ажыццяўлення пераемнасці.

Як вядома, народная культура — паняцце даволі шырокае. Яно ўключае матэрыяльную, духоўную і сацыяльную культуру і адлюстроўвае вопыт пакаленняў.

Няма сумнення ў тым, што без мінулага не будзе і будучыні. Забыццё і ігнараванне традыцый прывяло да несуцяшальных вывадаў. Традыцыі як сістэма эстэтычных прынцыпаў і густаў, творчых метадаў і канонаў выпрацоўваліся народам стагоддзямі. Іх рэстаўрацыя і ўзбагачэнне — адна з формаў пераемнасці, сувязі мінулага і сучаснага.

Сітуацыя ў рэспубліцы склалася такім чынам, што галоўную ролю носьбіта і транслятара традыцыі павінен узяць на сябе настаўнік. Ад яго прафесійнай падрыхтоўкі будуць залежаць і эфектыўнасць спасціжэння гуманістычнага сэнсу культуры, выяўлення духоўнасці, фарміравання ўстойлівага імунітэту супраць скажоных і недарэчных яе праяў, і эфектыўнасць працэсу развіцця творчай асобы, а значыць, узбагачэнне і стварэнне новых яе напрамкаў.

З гэтай нагоды пяць гадоў таму была распрацавана канцэпцыя групай выкладчыкаў, куды ўваходзіла і аўтар артыкула. На аснове гэтай канцэпцыі вядзецца падрыхтоўка педагогаў новага тыпу, якія павінны дапамагчы пакаленню XXI ст. гарманічна існаваць у прыроднай і сацыяльнай сферах, развіваць і ўдасканальваць сябе праз спасціжэнне вопыту, выпрацаванага прашчурамі.

Праграма прадугледжвае тры кірункі падрыхтоўкі спецыялістаў. Яны вызначаны спецыфікай жыццядзейнасці чалавека ў часе і прасторы, неабходнасцю развіцця здаровага грамадства і дзяржавы. Сістэма адукацыі папоўнілася першымі выпускнікамі, падрыхтаванымі па



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўказанай праграме. Гэта спецыялісты ў галіне фізічнай культуры і лячэбна-прафілактычнай работы, выкладчыкі сусветнай і айчыннай культуры з дадатковай спецыялізацыяй па фальклорным мастацтве, выкладчыкі выяўленчага мастацтва, чарчэння і народных мастацкіх рамёстваў, педагогі-мастакі.

Падрыхтоўка на факультэце заснавана на гісторыка-культуралагічным прынцыпе. Будучы выкладчык павінен уяўляць дынаміку першапачатковых культурных мадэляў. Гэта вымагае адпаведнай увагі да традыцыйнай культуры — міфалогіі (агульнай і нацыянальнай), этнаграфіі, фальклору, народных рамёстваў.

Мэты, задачы і віды падрыхтоўкі вызначаюцца генеральным напрамкам прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у рамках педагагічнага універсітэта.

Асноўнымі прынцыпамі падрыхтоўкі з'яўляюцца фарміраванне мабільных і адаптыўных якасцей спецыяліста, развіццё ў яго здольнасцей мэтанакіраванага пошуку неабходных навуковых ведаў з улікам апошніх дасягненняў навукова-тэхнічнага і культурнага прагрэсу, самаўдасканаленне прафесійных уменняў і навыкаў, актуалізацыя і прымяненне культурна-адукацыйных тэхналогій у практычнай дзейнасці. Відавочнай становіцца патрэба ў педагогу-даследчыку. Вызначэнне педагагічнага інструментарыя, выкарыстанне сістэмнага падыходу ў развіцці асобы таксама патрабуюць спецыяльнай падрыхтоўкі. Студэнты маюць шырокія магчымасці для паспяховай і плённай вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і мастацка-творчай працы. Напрамкі гэтай працы прадыктаваны новым падыходам да падрыхтоўкі педагога-даследчыка, спалучэннем у ёй агульначалавечага (універсальнага) і адметна індывідуальнага (нацыянальнага). З гэтай нагоды значным педагагічным дасягненнем сталі распрацоўка і ўкараненне сістэмы самастойнай вучэбна-творчай работы студэнтаў (СВТРС).

СВТРС дазваляе развіваць і выкарыстоўваць творчы патэнцыял студэнта для вырашэння актуальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

культурна-адукацыйных задач сучаснасці. Асноўнымі задачамі гэтай работы з'яўляюцца:

— авалоданне методыкай і сродкамі самастойнага рашэння навуковых і мастацка-педагагічных задач;

— азнаямленне з метадамі арганізацыі мастацкіх, педагагічных і навуковых калектываў, спецыфікай іх дзейнасці па вырашэнні актуальных навукова-педагагічных задач сучаснасці;

— паглыбленне і творчае засваенне праграмнага матэрыялу ў адпаведнасці з дзяржаўным стандартам.

Асноўныя кірункі СВТРС (вучэбны, навукова-даследчы, інавацыйна-метадычны, мастацка-творчы) вызначаны гэтым стандартам.

Вучэбны кірунак — гэта планавая, кіруемая пазааўдыторная работа студэнтаў, якая з'яўляецца працягам іх аўдыторнай работы, яна і дае магчымасць студэнту рэгуляваць сродкі і спосабы дасягнення канчатковага выніку ў вырашэнні вучэбных задач.

Навукова-даследчы кірунак прадугледжвае:

— работу студэнтаў у студэнцкіх навуковых гуртках;

— выкананне канкрэтных нетыповых заданняў навукова-даследчага характару ў перыяд педагагічнай і вучэбнай практыкі;

— вывучэнне тэарэтычных асноў методыкі, арганізацыі і выканання навуковых даследаванняў, планавання і арганізацыі навуковага эксперыменту, апрацоўкі даных;

— удзел студэнтаў у навукова-практычных семінарах, канферэнцыях, у выкананні дзяржбюджэтных, гасдагаварных працах, а таксама ў работах па творчым супрацоўніцтве з выкладчыкамі па іх індывідуальных планах;

— асветніцкую дзейнасць па распаўсюджванні ведаў у галіне педагагічнай навукі і культуры.

Інавацыйна-метадычны кірунак забяспечваецца:

— удзелам студэнтаў у рабоце нядзельных школ, гурткоў, студый, семінараў і кансультацыйных цэнтраў у якасці кіраўнікоў і выкладчыкаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— арганізацыяй умоў для даследавання ў галіне мастацкай педагогікі;

— выдавецкай і рэкламнай дзейнасцю ў мэтах рэалізацыі асноўных задач падрыхтоўкі спецыяліста;

— арганізацыяй спосабаў інавацыйна-метадычнай дзейнасці.

Дзякуючы мастацка-творчаму кірунку СВТРС ствараюцца ўмовы для рэалізацыі і развіцця творчага патэнцыялу асобы, фарміравання яе сацыяльнай, духоўнай і фізічнай культуры праз удзел у:

— гуртках, секцыях і студыях па інтарэсах;

— акцыях міласэрнасці і валанцёрскай дзейнасці;

— выставах, конкурсах і канцэртнай дзейнасці;

— асветніцкай дзейнасці па духоўным адраджэнні грамадства і стварэнні здаровага ладу жыцця;

— сацыяльным праектаванні і рэалізацыі яго вынікаў.

У працэсе падрыхтоўкі спецыяліста факультэт цесна супрацоўнічае з навучальнымі ўстановамі сістэмы адукацыі і культуры, музеямі як галоўнымі крыніцамі і захавальнікамі традыцыйнай культуры, грамадскімі арганізацыямі. Сумесна з імі распрацоўваюцца і праводзяцца навукова-практычныя семінары, канферэнцыі, выставачна-канцэртныя мерапрыемствы.

СВТРС арганічна звязана з навукова-даследчай дзейнасцю выкладчыкаў. Удасканаленне зместу адукацыі, распрацоўка інавацыйных метадаў выкладання, узаемасувязь аўдыторнай, самастойна-творчай працы, падрыхтоўка вучэбна-метадычных блокаў — вось далёка не ўвесь пералік зместу навукова-даследчай працы прафесарска-выкладчыцкага складу.

Упершыню ў сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне культуры ўведзена музейная практыка (канцэпцыя аўтара артыкула). Менавіта тая сітуацыя, якая склалася на сучасным этапе ў грамадстве, запатрабавала выкарыстання такіх сродкаў у адукацыйным працэсе асобы, як музейны прадмет, музейная экспазіцыя, музейная інфарматыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Роля музеяў у педагагічным працэсе цалкам не даследавана, а музейная педагогіка знаходзіцца ў стадыі канцэптуалізацыі. Тым не менш студэнты ўжо не адзін год супрацоўнічаюць са шматлікімі мастацкімі і краязнаўчымі музеямі. Студэнты працуюць і ў фондах, і ў асноўных экспазіцыях музеяў. Яны праходзяць тут першы этап свайго прафесійнага станаўлення — вывучаюць прадметы далёкай мінуўшчыны, спасцігаючы праз іх форму, змест і сэнс філасофскага быцця народа, яго традыцыі і гісторыю развіцця. Педагагічную цікавасць у гэтай рабоце выклікаюць розныя прадметы і творы культуры народа.

Лагічным працягам музейнай практыкі, наступным этапам у сістэме падрыхтоўкі педагога-мастака з'яўляюцца шматлікія выстаўкі, якія ладзяць студэнты. Адна з такіх выставак адбылася ў Раўбічскім філіяле Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Значную частку экспазіцыі займалі вышываныя ручнікі (педагог З.І.Зіміна), ткацтва (педагог Л.С.Паваркова), мастацкі роспіс (педагог Н.В.Пачынава). Многія з экспанатаў па праву могуць называцца творамі сучаснага мастацтва, якое працягвае лепшыя традыцыі беларускага народа. Сярод ручнікоў былі унікальныя экземпляры, зробленыя па невялічкіх фрагментах, якія цудам захаваліся ў музеях Беларусі, часцей за ўсё ў фондасховішчах. І гэта вельмі важная работа, бо такім чынам даецца магчымасць не толькі ўвесці ў навуковы абарот захаваны фрагмент, але і паказаць у экспазіцыі цалкам адноўлены прадмет, які мог быць назаўсёды страчаны для гледача, для нацыянальнай культуры. Каштоўнай з'яўляецца і праца з "бабуліным куфрам". Гэты напрамак работы патрабуе ад студэнтаў дакладных тэарэтычных ведаў у галіне народнай культуры, а таксама ў методыцы навукова-даследчай працы.

Студэнты падчас канікул шукаюць у сваіх бабуль, сваякоў рэчы традыцыйнай культуры, якія ўяўляюць цікавасць для даследчыкаў, капіруюць, узнаўляюць і

паўтараюць іх. Але задача навучэнцаў не абмяжоўваецца толькі тэхнічнай працай. Пачынаючы даследчык павінен разгадаць тайну прадмета, уявіць яго арганічнае існаванне ў прасторы і часе як культурна-гістарычнай катэгорыі. Толькі тады прадмет ажывае і пачынае ўзасмадзейнічаць з іншымі прадметамі, “працаваць” на сучасніка. Музейны прадмет становіцца не толькі цікавым з пункту гледжання яго навуковай значнасці, але і сродкам фарміравання эмацыянальнай сферы асобы, развіцця яе духоўнасці і гарманізацыі з Сусветам.

Уважлівыя адносіны да мовы прадметаў як аднаго з прынцыпаў адукацыі, што дазваляе ўзнавіць і рэканструяваць некаторыя старонкі гісторыі традыцыйнай культуры, закладзены ў рабоце выкладчыкаў. Гэта дазваляе студэнтам у будучым пераасэнсоўваць традыцыі з улікам сучаснасці і асабістага творчага патэнцыялу.

Менавіта такім чынам традыцыі гарманічна ўваходзяць у сучаснае жыццё, набываюць новае гучанне. Да сучасніка даходзяць прадметы, з якімі ён не змог бы пазнаёміцца нават у музеях.

Вядучымі рысамі новага педагога-мастака з’яўляюцца творчасць, самаўдасканаленне і самаразвіццё, адаптыўнасць і педагагічная мабільнасць, высокія агульначалавечыя і маральныя якасці. Ён не толькі вучыць дзяцей маляваць і чарціць. Галоўная яго справа — ствараць умовы для раскрыцця творчага патэнцыялу дзіцяці, выхоўваць чалавечае ў чалавеку праз любоў да традыцыйнага мастацтва. Гэта дазволіць будучаму педагогу-мастаку эфектыўна працаваць у шматлікіх сітуацыях, захоўваючы асноўныя прынцыпы перспектыўнай сістэмы адукацыі асобы — універсальнасць формаў і нацыянальнасць зместу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ